# НАТХНЕННЕ — У ЭМОЦЫЯХ

***У дзіцячай бібліятэцы мястэчка Шаркаўшчына працуе выстаўка «Моманты» мінскай мастачкі Яўгеніі Кавальчук***

**Яўгенія вырасла ў горадзе Глыбокае, скончыла СШ № 3, харэаграфічны клас ДШМ, потым дзіцячую мастацкую студыю ў настаўніцы Жанны Балабуевай. У 2013 годзе паспяхова скончыла БДУКМ. У 2014-м на выдатна абараніла магістарскую дысертацыю па спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства» ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Удзельнічала ў шматлікіх тэматычных выставах Глыбоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці.**




Першая персанальная выстава Яўгеніі «На скрыжаваннях лёсаў» была арганізавана таксама ў гэтым цэнтры ў 2018 годзе, потым у Доме рамёстваў г. п. Шаркаўшчына ў 2019-м. І вось другая — «Моманты», якая экспанавалася спачатку ў Глыбокім, а цяпер у Шаркаўшчыне.

З 2017 года Яўгенія працуе мастаком у студыі дызайну *«Wed-Art»*, што ў Мінску. Мастачка пазіцыянуе сябе як графік-партрэтыст, але часам і акварэль «бярэ яе ў палон». На партрэтах — душэўны стан кожнага з нас. Яўгенія чэрпае натхненне ў шматгранных чалавечых эмоцыях.

**Людміла КАЗІЦКАЯ**
**Фота даслана аўтарам**